# Прадмова

*Падрыхтаваны да выдання другі выпуск "Матэрыялаў да абласнога слоўніка Магілёўшчыны" працягвае публікацыю сучаснай дыялектнай лексікі і фразеалогіі з народных гаворак Магілёўскай вобласці. Структура дадзенага выпуску такая ж самая, як і першага (Мн.: "Навука і тэхніка", 1981). Аднак у гэты выпуск дадаткова ўключаны арыгінальны мясцовы маўленчы матэрыял, некаторыя словазлучэнні і словаформы, звязныя тэксты. Фактычны і ілюстрацыйны матэрыял сабраны студэнтамі беларускага аддзялення і выкладчыкамі кафедры беларускай мовы Магілёўскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута імя А.А. Куляшова за 1973 – 1983 гг.*

*Як і ў першым, у другім выпуску ўсе рэестравыя словы і выразы "Матэрыялаў" суправаджаюцца граматыка-стылістычнымі паметамі, што характарызуюць тую ці іншую лексему або фразему з боку адносін яе да пэўнай часціны мовы, а таксама лексічнай і сінтаксічнай спалучальнасці з іншымі словамі жывога маўлення. Пашпартызацыя прыкладаў-ілюстрацый падаецца па апошнім адміністрацыйна-тэрытарыяльным падзеле Магілёўскай вобласці.*